# ГАЛОЎНЫ ПАДАРУНАК — ЯРКІЯ ЎРАЖАННІ

## Фестываль «Вытокі» прайшоў у Пружанах

**ФАРМАТ новы, а атмасфера свята і разнастайная праграма нязменныя. У Пружанах прайшоў спартыўна-культурны фестываль «Вытокі». Для Брэстчыны гэта нагода для радасці, заўжды прыемна прымаць такія буйныя падзеі, а для іншых рэгіёнаў — нагода для лёгкага суму. Сёлета фестываль праходзіў толькі ў адным рэгіёне. Праўда, сумаваць, доўга не прыйдзецца. Ужо наступным летам святочную эстафету падхопіць іншая вобласць. Але пакуль падвядзём вынікі «Вытокаў» у першым рэгіёне.**






Фота НАК Беларусі.

«Не сакрэт, што Пружаны — гэта культурны, гістарычны і спартыўны горад. Рашэнне правесці ў Брэсцкай вобласці, першым рэгіёне, дваццатыя, юбілейныя, «Вытокі» невыпадковае. Наш фестываль і спартыўны, і культурны, і сямейны, дзе аб'ядналіся розныя сферы. А мы, як добрыя госці, прыехалі не з пустымі рукамі», — адзначыў **Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА.**

Адным з падарункаў гораду ад НАК Беларусі стала сучасная скейт-пляцоўка, якую ўрачыста адкрылі 7 чэрвеня. Яшчэ да афіцыйнага адкрыцця лакацыя сабрала нямала аматараў скейтбордынга, таму можна не сумнявацца, што пуставаць яна не будзе. Сярод першых яе пратэсціравалі шматразовыя чэмпіёны Расіі па скейтбордынгу і ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў у Токіа Аляксандр Гусеў, Ягор Кальдзікаў і Аляксандра Цімоніна, а таксама найлепшыя беларускія прадстаўнікі ролер-спорту і наймацнейшыя каманды краіны па брэйкінгу.

«Брэстчына заўсёды ўпэўнена рухалася ў спартыўным кірунку. Улічваючы вопыт нашага рэгіёна ў правядзенні фестывалю, пастараліся апраўдаць давер НАК Беларусі і ўлічылі ўсе магчымасці. Пружаны маюць добрую спартыўную базу: аквапарк, лядовы палац, прывялі ў парадак стадыён, цяпер і скейт-пляцоўка. Мы будзем і надалей працягваць падтрымліваць нашых спартсменаў», — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

Прынамсі не застаўся без падарункаў і сам Нацыянальны алімпійскі камітэт. Першая ў суверэннай гісторыі Беларусі алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн перадала ў музей НАК Беларусі сваю ўзнагароду — бронзавы медаль Алімпійскіх гульняў у Барселоне. «Шмат разоў наведвала НАК Беларусі, бачыла розныя прызы, кубкі, а ў маім стэндзе толькі копіі. Таму разам з дачкой вырашылі выправіць сітуацыю. Бронзавы медаль Барселоны-92 для мяне вельмі дарагі. Гэта мая першая алімпійская ўзнагарода, якую заваявала ў складзе квартэта больш вопытных сябровак па камандзе», — прызналася чэмпіёнка.

«Вытокі» ў Пружанах прыцягнулі да сябе не толькі аматараў спорту, але і чэмпіёнаў. Такой вялікай колькасці знакамітых атлетаў, чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, вядомых футбалістаў гэты горад, здаецца, не бачыў ніколі. Аляксандр і Андрэй Багдановічы, Ганна Гуськова, Максім Недасекаў, Васіліса Марзалюк, Алім Селімаў, Юлія Несцярэнка, Ірына Курачкіна, Марына Слуцкая, Аляксандр Глеб, Любоў Чаркашына зрабілі са сваімі аматарамі тысячы сэлфі і раздалі столькі ж аўтографаў. Легенды спорту сустрэліся не толькі на адкрыцці фестывалю і на спартыўных лакацыях, але і на футбольным полі. Таварыскі матч спартыўных зорак сабраў нямала гледачоў. Сапраўды, калі яшчэ ўбачыш каманды, сабраныя выключна з чэмпіёнаў.

Знакавай падзеяй стала і прэзентацыя кнігі першага алімпійскага чэмпіёна ў гісторыі беларускага спорту Сяргея Макаранкі. Пераможца Гульняў 1960 года, вясляр прадставіў свае мемуары, выдадзеныя пры дапамозе НАК Беларусі. Дарэчы, Сяргей Макаранка пачынаў свой шлях на Алімп у Брэсце, таму падзея ўдвая сімвалічная.

Адна з галоўных падзей у праграме «Вытокаў» — алімпійскі квэст. У адным месцы за некалькі гадзін дзеці да 14 гадоў маглі праверыць свае сілы ў 26 відах спорту, самых розных. А дапамагалі ім найлепшыя спартсмены і трэнеры. І весела, і карысна, бо такім чынам дзеці могуць зацікавіцца пэўным відам спорту і тут жа запісацца ў мясцовую секцыю. Прыемным дадаткам сталі каштоўныя падарункі ад арганізатараў, падрыхтаваныя для пераможцаў квэсту. Спартыўна-гістарычны квэст сабраў 15 каманд, якія прайшлі 7 розных пунктаў, звязаных з гісторыяй і культурнай спадчынай Пружан: Палац культуры, Гандлёвыя рады, сядзіба Швыкоўскіх і іншыя. Удзельнікі сумяшчалі скаканне на скакалцы з адгадваннем імёнаў алімпійскіх спартсменаў, прысяданне з разгадваннем рэбуса і стральбу з асацыяцыямі.

«Вытокі» — фестываль ва ўсіх сэнсах яркі. І за гэта адказвае адзін з галоўных арганізатараў — мастацкая галерэя «АртХаос», якая кожны раз прыдумвае для гасцей фестывалю нешта незвычайнае. Сёлета дзеці на стадыёне «Мухавец» афармлялі скейт-пляцоўкі і горкі для катання. Самыя старанныя юныя мастакі атрымалі прызы. У мастацкім інтэрактыве прынялі ўдзел больш за 200 дзяцей. Усяго фестываль у Пружанах сабраў некалькі тысяч удзельнікаў.

Узровень

# НАСТАЎНІК ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ МАЙСТРАМ СПОРТУ ПА ЎСІХ ВІДАХ СПОРТУ

## Як такое магчыма, расказаў заслужаны педагог



**Усе прывыклі звяртаць пільную ўвагу найперш на спорт вышэйшых дасягненняў, на медалі і рэкорды. А часта аснова гэтага спорту, падмурак, без якога не было б ні медалёў, ні рэкордаў, застаецца ў цені. Калі шчыра, то што для многіх школьныя ўрокі фізічнай культуры? Часцей за ўсё, урок, які пры жаданні можна прагуляць і за адзнаку па якім не варта моцна турбавацца. А разам з тым фізічная культура — прадмет, які выконвае найважнейшую задачу. Робіць дзяцей і падлеткаў развітымі, здаровымі і моцнымі. Фізічная форма, закладзеная ў дзяцінстве, застаецца з чалавекам назаўжды. Канешне, пры ўмове, што педагог ставіцца да сваёй справы адказна і з душой. Настаўнік фізічнай культуры і здароўя Брэсцкага абласнога кадэцкага вучылішча Леанід КАБЯК працуе ўжо 50 гадоў. У інтэрв'ю «Звяздзе» ён расказаў, што галоўнае ў выхаванні дзяцей, чаму не трэба быць «фізруком» і як школьная фізкультура ўплывае на спорт.**

### СЯМ'Я І МОЦНАЯ КАМАНДА

«Савецкія дзеці любілі адных і тых жа людзей: Льва Яшына, Мікалая Озерава, Эдуарда Малафеева, Міхаіла Мустыгіна. Мы ўсе балелі за Аляксандра Мядзведзя, Валерыя Шарыя, Уладзіслава Сапею і іншых славутых спартсменаў. Спорт быў ладам жыцця кожнага савецкага хлопчыка: гульні ў футбол вуліца на вуліцу, спартыўныя секцыі, дзіцяча-юнацкая школа. Таму ўжо ў 10 класе я вырашыў стаць настаўнікам фізічнай культуры. Бацькоў мой выбар расчараваў, яны бачылі мяне афіцэрам ці ўрачом. Але, нягледзячы на маміны словы «хочаш — паступай, хочаш — не паступай», я паступіў на факультэт фізічнага выхавання Брэсцкага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння атрымаў накіраванне ў вёску Ястрамбель Баранавіцкага раёна. І вось 50 гадоў я ўжо тут», — успамінае Леанід Мікалаевіч.

**Выхавальнікі школы-інтэрнат са сваім настаўнікам былі не толькі сям'ёй, але і моцнай камандай. Разам яны неаднойчы перамагалі на розных спаборніцтвах, нярэдка нават на ўсесаюзных. Для школы-інтэрната з Баранавіцкага раёна перамагчы на турніры ўсесаюзнага ўзроўню — амаль што выйграць Алімпійскія гульні.**

У той час у Ястрамбелі працавала школа-інтэрнат для дзяцей-сірот, якая і стала першым месцам працы маладога настаўніка. Пачынаць педагагічную дзейнасць з дзяцей-сірот — задача няпростая. Але так толькі здаецца. «З сіротамі было цяжка працаваць у першым класе, калі іх прывозілі з усёй нашай вялікай краіны. Яны былі некіравальныя, першыя паўгода дакладна трэба было вадзіць кожнага за ручку. У першы год маёй працы ў першым класе было 42 чалавекі, з іх 7 — з затрымкай псіхічнага развіцця. Праз паўтара месяца мяне выклікаў дырэктар і спытаў: «Сынок, што ты з імі робіш?». На маіх занятках усе былі пры справе: хто можа і хоча, той скача, бегае, хто хоча яму для скачкоў рыхтаваць — той рыхтуе, абы не ўцёк. Сірот трэба было «прыручыць». Калі гэта зрабіў паспяхова — праблем не будзе. Да сёмага класа дакладна. А там ужо пачынаецца пераходны ўзрост, некаторыя пачынаюць жыць «па паняццях», і там трэба жорстка ставіць дысцыпліну. Але гэта ўжо свае дзеці, ім можна калі і перніка даць, а калі і пугі. Я ставіўся да сваіх сірот па-бацькоўску: шмат ім даваў, але і шмат патрабаваў. І мы маглі ад іх патрабаваць, бо ўвесь педагагічны калектыў быў неабыякавы да гэтых дзяцей. Мы былі для іх больш, чым настаўнікі, яны для нас — больш, чым вучні», — разважае Леанід Мікалаевіч. Самы красамоўны паказчык такога стаўлення — той факт, што выпускнікі Ястрамбельскай школы-інтэрната і сёння трымаюць сувязь са сваім настаўнікам, тэлефануюць, прыязджаюць у госці, віншуюць са святамі. Ордэн Працоўнай Славы III ступені, якім у 1986 годзе ўзнагароджаны Леанід Кабяк, і прысвоенае ў 1997 годзе ганаровае званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь» таксама таму пацвярджэнне. Але ж за ўсімі высокімі ўзнагародамі стаіць, найперш, стаўленне да сваёй працы і адносіны з вучнямі. Магчыма, гэта нават вышэй.

Выхавальнікі школы-інтэрната са сваім настаўнікам былі не толькі сям'ёй, але і моцнай камандай. Разам яны неаднойчы перамагалі на розных спаборніцтвах, нярэдка нават на ўсесаюзных. Для школы-інтэрната з Баранавіцкага раёна перамагчы на турніры ўсесаюзнага ўзроўню — амаль што выйграць Алімпійскія гульні. І ўсё дзякуючы іх настаўніку. У 2011 годзе з сіротамі Леанід Кабяк перастаў працаваць, але месца працы не змяніў. Школа-інтэрнат у Ястрамбелі была расфарміравана, а на яе месцы стала дзейнічаць Брэсцкае кадэцкае абласное вучылішча. «З кадэтамі працаваць прасцей, чым з сіротамі. У вучылішчы ёсць правілы, якім яны падпарадкоўваюцца. Але, зноў жа, у першы год трэба да гэтага прывучаць. Усе дзеці з розных школ, у іх розны ўзровень падрыхтоўкі, рознае выхаванне. Зноў жа, гэта падлеткі, паступаюць да нас у восьмы клас. І пакуль усіх параўняеш, раскрыеш, трэба паваждацца. А ў 10-11 класах ужо прасцей: яны матываваныя, у іх ёсць мэты, і яны дзеля іх працуюць. Многія нашы выпускнікі паступаюць у сілавыя структуры, фізічная культура ім патрэбная, і яны займаюцца ўпарта і адказна не толькі на ўроках, але і на дадатковых занятках», — распавядае Леанід Мікалаевіч. З-за такога графіка сваіх выхаванцаў на рабоце ён праводзіць шэсць дзён на тыдзень: трэніровак і ўрокаў фізічнай культуры ў кадэтаў шмат. І відаў спорту, якімі яны займаюцца, хапае: футбол, баскетбол, валейбол, гандбол, настольны тэніс, лёгкая атлетыка. У графіку таксама заняткі плаваннем і агульнай фізічнай падрыхтоўкай.

«Цяжка бывае толькі штацкім, а мы людзі ваенныя, жывём па прынцыпе «не хочаш — прымусім, не ўмееш — навучым», — жартуе Леанід Мікалаевіч, адказваючы на пытанне, ці не цяжка працаваць у такім рытме.

### ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — ВЫХАВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ ЗДАРОВЫМІ

Нярэдка ад трэнераў можна пачуць, што для развіцця спартыўнага рэзерву ім трэба супрацоўнічаць са школьнымі настаўнікамі фізкультуры, якія часцей за ўсё працуюць самі па сабе. А менавіта яны могуць на месцы ўбачыць здольнага хлопчыка ці дзяўчынку і адкрыць яму шлях у спорт. І гэта агульная праблема. Як адзначае Леанід Кабяк, раней было цяжка знайсці хлопчыка, які б не ўмеў гуляць у футбол, а сёння цяжка знайсці хлопчыка, які ўмее гуляць у футбол. Па яго словах, здараецца, што дзеці, якія паступаюць у кадэцкае вучылішча, за сем гадоў у школе не трымалі ў руках мяча. І пра які спорт у такім выпадку можна казаць? Таму, сапраўды, уся надзея на настаўнікаў фізічнай культуры.

«Настаўнік фізічнай культуры павінен быць майстрам спорту па ўсіх відах спорту. Але ў яго яшчэ шмат папяровай працы, якая забірае час. Таму настаўнік фізкультуры не павінен рыхтаваць спартсменаў. Настаўнік фізкультуры павінен быць зацікаўлены ў тым, каб як мага больш яго вучняў перадаць у дзіцяча-юнацкую спартыўную школу, дзе з іх зробяць спартсменаў. Там у трэнераў свае задачы, а ў нас свае. І самая галоўная задача настаўніка фізічнай культуры — выхаваць дзяцей здаровымі, далучыць іх да здаровага ладу жыцця», — адзначае Леанід Мікалаевіч. Прынамсі свой уклад у развіццё айчыннага спорту ён унёс. У 1996 годзе Леанід Кабяк быў узнагароджаны ганаровым знакам за развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь. І ў яго нават ёсць рэцэпт, як зрабіць так, каб дзеці самі хацелі ісці на ўрокі фізкультуры, а не прагульвалі іх пры зручнай магчымасці: «На мой суб'ектыўны погляд, адзнакі па фізічнай культуры ўвогуле варта скасаваць. Прыйшоў на ўрок, адпрацаваў у сваё задавальненне, адпачыў, разгрузіў галаву пасля задач ды дыктантаў — і шчаслівы пайшоў вучыцца далей. На ўроках фізкультуры трэба не адзнакі ставіць, а закладваць у дзецях фізічную падрыхтоўку і павышаць яе, наколькі гэта магчыма для кожнага вучня», — разважае настаўнік. Але далёка не ўсе гэта разумеюць, таму, гледзячы праўдзе ў вочы, трэба прызнаць, што фізічная культура недаацэньваецца. «У гэтым мы, настаўнікі фізкультуры,



вінаватыя. Мы самі дазволілі называць сябе фізрукамі, таму што так працуем. Можа, нам не хапае агульнага ўзроўню культуры, ды і ведаў таксама. Трэба працаваць так, каб цябе называлі не фізруком, а настаўнікам фізічнай культуры і здароўя. Мы ў вучылішчы так вызначылі: усе ўрокі важныя, але фізкультура важнейшая. Чаму так? Таму што фізкультура — адзіны прадмет, які ёсць у праграме з 1 да 11 класа. Ніводны прадмет больш так не выкладаецца. І маім калегам трэба самім пра гэта памятаць», — разважае Леанід Мікалаевіч. Вось ён і нагадвае ўласным прыкладам. Урокі фізічнай культуры і здароўя, спартыўныя секцыі, раённыя, абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы — разам са сваімі падапечнымі ён усюды ў цэнтры падзей. «Самае прыемнае ў маёй рабоце — бачыць вынік. Мы, настаўнікі, не адразу яго бачым. Але, калі да нас прыязджае ў госці моцны, фізічна развіты чалавек, выхаваны, удзячны, — найлепшага задавальнення не знайсці, — дзеліцца Леанід Мікалаевіч. — Я ніколі не думаў, што змагу адпрацаваць аж 50 гадоў. Але яны былі насычаныя рознымі яркімі падзеямі, падарылі мне мноства цудоўных людзей, што праляцелі вельмі хутка. І ўсё гэта дзякуючы фізічнай культуры. У маім узросце ў асноўным жывуць успамінамі. А дзякуючы фізкультуры ў мяне вельмі шмат цёплых успамінаў».

**Фота з асабістага архіва героя.**

*г. Баранавічы.*

Дата

# Стадыён «Дынама» святкуе юбілей

## Найлепшы падарунак — яркія спаборніцтвы

**Ён мае надзвычай багатую гісторыю, яго сучаснасць неверагодна насычаная. Яго ведаюць амаль ва ўсім свеце, у свеце спорту дакладна. Гэта, без перабольшвання, адзін з брэндаў Беларусі. І гэта — Нацыянальны алімпійскі стадыён «Дынама», якому сёлета спаўняецца 90 гадоў.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Гэты аб'ект з'яўляецца цэнтрам прыцягнення жыхароў Мінска і яго гасцей. Ён бачыў мноства зорак спорту розных часоў. У 1951 годзе тут прайшоў чэмпіянат СССР па лёгкай атлетыцы. Стадыён, як і многія іншыя мінскія пабудовы, значна пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але да чэмпіянату яго паспелі аднавіць і правялі спаборніцтвы на высокім для таго часу ўзроўні. І гэта стала пачаткам слаўнай гісторыі — з таго часу спартыўныя форумы на «Дынама» пакідаюць ва ўсіх выдатныя ўражанні. Таму сведчанне і матчавая сустрэча СССР — ЗША па лёгкай атлетыцы 1973 года. Тут у 1980 годзе прайшоў алімпійскі турнір па футболе. Менавіта на «Дынама» Аляксандр Мядзведзь запаліў агонь маскоўскай алімпіяды. Нямала слаўных момантаў у гісторыі стадыёна і ў XXI стагоддзі: у 2008 годзе БАТЭ сустрэўся з Ювентусам на дынамаўскім полі. Тут праходзілі першая матчавая сустрэча Еўропа — ЗША па лёгкай атлетыцы ў 2019 годзе, адкрыццё II Еўрапейскіх гульняў у тым жа годзе.

«Дынама» — аб'ект шматфункцыянальны. На стадыёне часта збіраюцца не толькі аматары спорту, але і музыкі. Гэта выдатная канцэртная пляцоўка, якую высока цэняць зоркі беларускай і замежнай эстрады. У апошнія гады тут часта праходзяць летнія фестывалі розных кірункаў. А ў кінапаказы пад адкрытым небам у апошнія два гады мінчане літаральна «закахаліся». Аднак пануе на «Дынама» ўсё ж такі спорт, у прыватнасці лёгкая атлетыка і футбол.

Своеасаблівым падарункам да юбілею знакамітай арэны стаў таварыскі матч футбольных зборных Беларусі і Расіі, які прайшоў 7 чэрвеня. На жаль, беларуская зборная не змагла зрабіць сваім аматарам падарунка і прайграла з вынікам 0:4. Аднак у той дзень, асабліва перад матчам, стадыён зноў віраваў. На доўгачаканы матч (а нацыянальная зборная па футболе тры гады не выступала дома) сабралася больш за 21 тысячу чалавек. Арганізатары падрыхтавалі для іх сапраўднае шоу. На тэрыторыі каля стадыёна размясціліся дыджэі, фотазоны, фудкорты, праводзілася мноства футбольных актыўнасцяў для дзяцей і дарослых. Перадматчавае шоу з удзелам знакамітых артыстаў таксама дадало настрою аматарам. Атмасфера спартыўнага свята, музыка, дзіцячы смех і шчаслівыя наведвальнікі — тое, што так пасуе любімаму ўсімі стадыёну «Дынама». І няхай так будзе і далей!

Напярэдадні

# Чым будуць здзіўляць Гульні БРІКС

## Беларускія спартсмены гатовы радаваць поспехамі

**Адзін з асноўных стартаў гэтага лета пачынаецца. 12 чэрвеня ў Казані адкрыюцца Гульні краін БРІКС. Сам турнір не новы: упершыню спаборніцтвы сярод краін, якія ўваходзяць у БРІКС, прайшлі ў 2017 годзе ў Індыі, затым форум прымалі Кітай і Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка. На гэтым тыдні адкрыюцца чацвёртыя Гульні БРІКС. Кожны год арганізатары дапаўняюць праграму спаборніцтваў новымі відамі і дысцыплінамі, што робіць форум адметным. Арганізатары форуму ў Казані зрабілі гэта па максімуме.**

Самае галоўнае — адкрыты фармат спаборніцтваў. У Казані чакаюць каля пяці тысяч атлетаў больш чым з 60 краін. Усяго яны разыграюць 387 камплектаў медалёў. Для беларускіх спартсменаў Гульні ў Казані стануць адным з галоўных стартаў гэтага сезона. Усяго ў праграме форуму 27 відаў. Нашы спартсмены будуць прадстаўлены ва ўсіх, акрамя акрабатычнага рок-н-рола. У папярэдні склад зборнай Беларусі ўвайшло каля 620 чалавек (у тым ліку суддзі, кіраўнікі, прадстаўнікі федэрацый). Спартсменаў — каля 400 чалавек.

Адну з самых вялікіх беларускіх каманд складаюць беларускія лёгкаатлеты — 81 чалавек. Сярод іх і лідары: Эльвіра Грабарэнка, Ірына Жук, Таццяна Халадовіч, Аляксей Каткавец, Мацвей Воўкаў і іншыя. З-за рашэнняў міжнародных спартыўных арганізацый беларускія лёгкаатлеты не могуць выступаць на буйных міжнародных стартах, шлях на Алімпійскія гульні ў Парыжы ім таксама закрыты. Таму на Гульнях БРІКС яны збіраюцца паказаць усё, на што здольныя. Можна не сумнявацца: барацьба на цэнтральным стадыёне Казані будзе напружанай.

«Разам з вопытнымі спартсменамі мы ўзялі і маладых лёгкаатлетаў, учарашніх юніёраў, на якіх робім стаўкі ў многіх дысцыплінах лёгкай атлетыкі. План толькі адзін — дастойна прадставіць сваю краіну, паказаць вынікі, якія дазволяць змагацца за медалі. У нас ёсць усё для гэтага. Нядаўна ездзілі на камандны чэмпіянат Расіі, нашы атлеты выступілі дастойна, заваявалі шмат медалёў. Я спадзяюся, на Гульнях БРІКС будзе не менш, а нават болей», — адзначыў **дзяржаўны трэнер па лёгкай атлетыцы Ігар СІВАДЗЕДАЎ.**

Вяслярны беларускі дэсант высадзіцца ў Казані. У камандзе па веславанні на байдарках і каноэ 34 чалавекі, па акадэмічным веславанні — 30. Паказаць клас плануюць прымы жаночага веславання на байдарцы Марына Літвінчук і Вольга Худзенка. Паколькі мацнейшых спартсменак у жаночым веславанні на байдарцы у алімпійскім Парыжы таксама не чакаюць, у Казані Вольга і Марына пакажуць, што страціў міжнародны спорт, адхіліўшы іх.

Беларуская спартыўная дэлегацыя будзе зіхацець зоркамі беларускага спорту. Каманда пад нашым сцягам сабралася салідная. У Казані плануе выступіць бронзавы прызёр чэмпіянату свету па сінхронным плаванні — 2024 Васіліна Хандошка. На цяжкаатлетычны памост выйдзе сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 2016 Дар'я Навумава. Спаборніцтвы па самба зробяць цікавымі чэмпіёнкі свету Даніэла Ждан і Анжэла Жылінская.

Сёлета Казань стала цэнтрам спартыўных навацый — у лютым тут прайшлі «Гульні будучыні», спаборніцтвы па фіджытал-спорце. Новы кірунак аб'ядноўвае спорт рэальны і віртуальны. І ён таксама будзе прадстаўлены на Гульнях БРІКС. У праграму ўвайшлі фіджытал-баскетбол і фіджытал-футбол. Спачатку баталіі на віртуальных пляцоўках NBA і FIFA адпаведна, затым — на рэальных. Мяркуецца, што гэта прыцягне больш моладзі.

«Нашымі галоўнымі сапернікамі, мяркуецца, будуць расійскія спартсмены. Улічваючы вынікі «Гульняў будучыні», канкурэнцыю складуць баскетбалісты з Сербіі. Насамрэч, цяпер цяжка рабіць нейкія прагнозы, бо нашы каманды раней не выступалі ў спаборніцтвах па баскетбольным дваяборстве. Таму здзівіць могуць усе. Гэта для ўсіх новы кірунак, мы ўсе знаёмімся з віртуальным баскетболам. Нават цяжка сарыентавацца, на што рабіць стаўку: на кіберчастку або на рэальны баскетбол. Але я не сумняваюся, што спаборніцтвы будуць цікавыя і прынясуць нашым спартсменам карысны досвед», — адзначыла **Настасся МАРЫНІНА, генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола.**

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**